Навукова-папулярнае выданьне

**Марк Бартушка**

# ПАРТЫЗАНСКАЯ ВАЙНА Ў БЕЛАРУСІ Ў 1941—1944 ГГ.

*Выданьне трэцяе, папраўленае*

Пераклад: Алена Талапіла
Навуковы рэдактар: Аляксандар Пашкевіч
Рэдактар: Аляксандра Макавік
Карэктар: Віктар Жыбуль
Вёрстка: Сяргей Кандраценка
Дызайн вокладкі: Антон Баранаў
Адказны за выпуск: Аляксандар Пашкевіч

Падпісана ў друк: 16.12.2013. Фармат 70x100 1/16
Друк афсэтны. Гарнітура Школьная. Ум.-друк. арк. 15,64
Наклад 500 асобнікаў. Замова

Выдавец:
Таварыства з абмежаванай адказнасьцю «Інбелкульт»
АДРН 1136733002120
пас. Малкамбіната, д. 21, 216790
г. Рудня Смаленскай вобласьці, Расейская Фэдэрацыя

Паліграфічнае выкананьне:
Таварыства з абмежаванай адказнасьцю «Мэдысонт»
ЛП № 02330/0552782 ад 01.10.2010
вул. Цiміразева, д. 9, 220004, Менск

Марк Бартушка

# Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг.



ISBN 978-5-9904531-8-0

# Марк Бартушка

# Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг.




Захоп Савецкім Саюзам Заходняй Беларусі ў 1939 г. прывёў да гвалтоўнай эскаляцыі шмат якіх доўга назапашваных канфліктаў. Упершыню ў вялікім маштабе людзі мелі магчымасьць «адпомсьціць» — матывацыя, якую новыя ўлады толькі падтрымлівалі і выкарыстоўвалі. Абдзеленыя раней групы раптоўна атрымалі магчымасьць ажыцьцявіць свае мэты, у тым ліку з ужываньнем сілы. Частка насельніцтва з гатоўнасьцю скарысталася шанцамі на сацыяльны рост, эканамічнае пераразьмеркаваньне і зьнішчэньне старых элітаў, прапанаванымі новай сытуацыяй і палітыкай савецкіх уладаў перадусім на першым этапе савецкага панаваньня. Палітыка жорсткіх рэпрэсіяў «зьверху», а таксама гарызантальнае ўжываньне сілы ўнутры грамадзтва, значна павялічылі канфліктны патэнцыял. Узброеная і нярэдка агрэсіўная ўласная ініцыятыва раптоўна стала магчымасьцю, за якую ўхапілася нямала людзей. Гвалт як сродак зьвядзеньня рахункаў стаў квазілегітымным, пакуль ён не супярэчыў інтарэсам новых гаспадароў. Прывілеяваныя раней пласты насельніцтва сталі ня толькі ахвярамі вонкавага гвалту, але супраць іх маглі выступіць і ўласныя суседзі. Агрэсія, якая выбухала паміж жыхарамі Беларусі, верагодна, у значнай ступені мела індывідуальныя і сацыяльныя матывы, хоць палітычныя аспэкты кшталту нацыялістычных амбіцыяў таксама гралі ролю.